# Сусветны дзень паэзіі

У звароце народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча да юных паэтаў выяўлена асноўная мэта беларускай паэзіі і літаратуры ў цэлым: *«Узняцца так на крылах песні, // Каб чуў і бачыў цэлы свет»*. А для чаго? Каб *«не быць Радзіме безыменнай, // Зямлі бацькоў – не анямець»*. Мала заняць *«свой пачэсны пасад між народамі»* (Янка Купала), трэба гэты «пасад» узбагаціць, упрыгожыць, узвялічыць. Літаратура – не навука ці прамысловасць, сельская гаспадарка, спорт, але і яна ў вялікай ступені ўзбагачае, упрыгожвае, узвялічвае родную краіну. Эстэтычна ўзбагачае, упрыгожвае і ўзвялічвае. У тым ліку і ў немалой ступені – паэзіяй як агульнанацыянальнай духоўнай каштоўнасцю (Вячаслаў Рагойша «Верш. Паэзія: энцыклапедычны даведнік», 2020).

*Алена Маеўская*

**ВОБЛАКІ**

О што быў за дзень такі?
Адны толькі воблакі:
Імчалі, нібы алені,
Прыпадаючы на калені.
О што быў за дзень такі?
Куды ж яны, дзівакі?..
Іх шэрыя статкі радзелі,
Капыты іх пелі: «Надзеі,
Надзеі, надзеі, надзеі…»
І зь неба дажджы ляцелі.
О што быў за дзень такі?
Адны толькі воблакі…

*Алена Маеўская*

***

Ніхто не ўцячэ
Ракою назад,
І дзверы ніхто
Не зачыніць у бязьмежнасць…
Ня скончыцца дождж,
Пакуль ня вырастуць
Дрэвы.
Ня скончыцца дзень,
Пакуль ня знойдуць
Крэсіва,
Каб запаліць
Зоркі.

*Аляксандр Быкаў*

**МАМАНТЫ**

Бачыла толькі поўня
Слабасць вялізнай сілы:
Маманты ўсе раптоўна
У мерзлаце спачылі.
Колькі ні ёсць загадак –
Гэта для нас няўцемна.
Проста такі парадак,
Так захацела Цемра.
...Поўня ў нябёсах чорных.
Шлях. І ў крыжах пагорак.
Толькі зямны наш човен
Ціха плыве між зорак...

*Аляксандр Быкаў*

***

Марнееш пакрысе
Ці полымем гарыш –
Ва ўсе часы, ва ўсе
У кожнага свой крыж.
Гадоў на схіле, там,
Дзе ўжо няма дарог,
У кожнага – свой храм,
У кожнага – свой Бог.
У белы свет ляцім,
Як галавой у вір.
І роўныя ва ўсім,
Калі засыпле жвір…



# *Данута Бічэль-Загнетава*

***

Дзе ткуць павукі
дываночкі на пожні,
на золкай зямлі,
дзе, як сосны, згарым,
хай будзе апошняе слова
апошнім.
Хай будзе апошняе слова тваім.

У лесе, дзе ўлетку
ад ягадаў цесна,
над борам, куды мы
адправімся ў вырай,
хай вырвецца шчыраю
першая песня.

Хай новая песня
без нас будзе шчырай.

# Данута Бічэль-Загнетава

***

*Маладзікова.*
*Ягадна.*
*Клянова.*
*Двух сэрцаў –*
*двух сусветаў прыцяжэнне,*
*як быццам нарадзілася нанова.*
*Як быццам*
*гэта мае прадаўжэнне.*

*Але не мае будучыні тое,*
*што будучыні прад сабой не мае.*
*Над іншымі,*
*хто ў сведкі ноч наймае,*
*хай злітуецца сонца залатое.*

***

Ты пайшла,
ты чамусьці пайшла,
і я
стаў калодзежам без вады,
стаў вясновым кустом без лісця,
але болей за ўсё
стаў падобны на клетку,
якую пакінула птушка…

Чую, у садзе чужым пяе,
бачу між дрэў залачоную клетку.



*Міхась Стральцоў*

*Міхась Стральцоў*

***

У горадзе,
пасля дажджу,
на плошчы знаёмай,
дзе болей машын,
чым знаёмых людзей,
ля брыжыка тратуара, –
адшліфаванага так нагамі,
як у пад’ездзе колішнім
нашым
лесвіца, –
у лужыне з восеньскім жоўтым лістком
мільгнуўся адбітак твой…
Ты была ці не ты?

Рушылі людзі.
Быў светафор і машыны.
Ты была ці не ты?..
…не разглядзеў.

## ЦЫРК

Я нарадзілася
з вандроўным цыркам
унутры.
З цыркам, толькі падумай,
у палескай вёсцы.
Жанглёры, акрабаты,
барадатыя жанчыны…
Які сорам!

Вандроўны цырк
вырастаў разам са мной,
як ваўчаня, што хоча мяса,
яны ўсе хацелі феерверкаў
і шырокіх дарог.
А тут
бураковыя палі,
каларадскія жукі,
народныя прыкметы.

Я хавала свой цырк
між старонак кніг,
як гербарый.
Жанглёраў, акрабатаў,
барадатых жанчын
я выпроствала
ў спадзеве высушыць
іхнія прагныя целы.

Але цыркачы
адмаўляліся гінуць,
яны раслі і мацнелі
пад коўдрай старонак,
на калорыях літар,
у шатры майго цела.

Яны вучыліся
цыркавым хітрыкам,
як вучацца качаняты,
кураняты, парсючкі.

І калі набраліся сіл,
знайшлі драбіны,
накрэмзалі мапу –
калі змаглі ўсё тое,
чаго хацелі й што мусілі…

Цыркачы мяне скралі.
Цыркачы мяне з'елі.

Цыркачы адкрылі
нарэшце ўва мне
свой вандроўны цырк.

*Юля Цімафеева*

***
Кажуць, ён разбурае замкі.
Куды ні прыйдзе,
адным паглядам
руйнуе
сярэдневечныя руіны.
Яны рассыпаюцца ў пыл,
робяцца полем,
і тады нехта
аплаквае гэтае месца,
а нехта
будуе, што хоча.

Кажуць, ён так зарабіў
шмат грошай,
бо ў тых далёкіх
басурманскіх краінах
ніхто не плача па замках,
там добра плацяць
за якаснае руйнаванне.

А мы не пусцім яго да сябе,
мы не дадзім яму візы,
мы закрыем нашае неба
ад яго самалётаў,
узарвем рэйкі
для яго цягнікоў.
Нашы дарогі
засадзім да гарызонту
шыпамі з металу.
Мы ніколі
не пакажам яму
нашы
сярэднявечныя
фартэцыі
і пяцісотгадовыя муры.

Няхай нашыя замкі
паміраюць самі.
Няхай там вольна
бегаюць мышы,
няхай вясковыя дзеці
узрываюць рудыя аркі,
а іхнія бацькі збіраюць
цэлыя цагліны
і нясуць на падворкі.

Ніколі не кажыце,
што ў нас ёсць замкі.
Каб ён да нас не прыехаў
і не знішчыў
усё,
што ў нас ёсць.

*Юля Цімафеева*

*Анатоль Грачанікаў*

**НОВЫ ДЗЕНЬ**

Наплывае
З прыцемкаў рама
На аркуш неба чарцяжом не новым.
Мякка ў шыбку шкрабаецца ранак
Промнем блакітна-ружовым.
Цемра ў ценях рухавых гіне,
Новы дзень рассцілаецца
Незаплямленай стужкай.
Што напіша на ёй,
Пакіне
Звер,
Чалавек,
Птушка?

## *Анатоль Грачанікаў*

***

За горадам – яшчэ зіма.  
Ад сонца весняга упрэлая,  
Свае сувоі парудзелыя  
Ужо не выбеліць сама.  
А ў скверах – кволы аксаміт, –  
Блішчасты цень мінулагодняга, –  
Зачэзлы без цяпла лагоднага,  
Глядзіць у выцвелы блакіт.

Глядзіць дрыготка, незатоена,  
Да рэшты вымерзлы спярша.  
Прырода ў гэты час раздвоена,  
Як чалавечая душа.

## *Таіса Бондар*

***

І за зло –
хай дорага! –
заплачу дабром,
толькі б сярод ворагаў
не шукаць сяброў.
Толькі б верыць першаму
поціску рукі,
калі плакаць –
вершамі,
змогшы зман цяжкі.
І на здраду здрадаю
не адказваць, жыць
верай безаглядна ю,
ёю даражыць.
Толькі б радасць помніла:
неба адцвітае
сонечнымі промнямі –
месяц на куце!
Сонца… Месяц…
Крыўдаю
іх не патушыць!
Прыйдзе час – развіднее
ў кожнае душы…

Таіса Бондар

***

Навошта я – паэт?
Калі б ты знаў, як мала
таго, што цэлы свет
на крылах слоў трымала
не я – не я адна!
Калі б ты знаў, як проста
нашчэнт не бачыць дна,
кідаючыся ў прастрань.
Абы гучаў, гукаў
хоць чыйсьці клік трывожны –
душа, а не рука
лавіла водгук кожны,
не літасці нябёс –
прасіла мукі новай…

І зноў ламаўся лёс –
і выжывала слова.

*Ніл Гілевіч*

***

Ёсць водападзел
Рэчак і рэк на зямлі –
Воля прыроды!
А ёсць і водападзел
Душ. Чыя ж бы тут
воля?

***

Гляджу на пусты,
Голы садок. А ў думках:
З кім я? І што я?..
На бязлістай галінцы
Склее забыты яблык.

## Ніл Гілевіч

***

*Па чым пазнаю,*
*Што ты – мой брат*
*беларус?*
*У тваіх вачох –*
*Наша гісторыя ўся,*
*Усе дзесяць стагоддзяў.*

***

*Усё замёрла:*
*Ні лісток, ні травінка –*
*Не шалахнуцца.*
*Бы ў чаканні прысуду,*
*Што зараз абвесціць*
*гром.*




























З творчасцю згаданых аўтараў можна пазнаёміцца ў краязнаўчым цэнтры бібліятэкі.

# Дзякуй за ўвагу!

Выстаўку падрыхтавала супрацоўніца краязнаўчага цэнтра
ДУК «Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І. Х. Каладзеева»
Крывецкая Ксенія
2021 г.